**УДК 340.12**

# ПЕРАЕМНАСЦЬ І ДЫСКРЭТНАСЦЬ У ПРАВЕ ПАДЧАС РЭФОРМАЎ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У СЯРЭДЗІНЕ – КАНЦЫ XVIII СТАГОДДЗЯ

***канд. юрыд. навук Д.В. ШЧЭРБІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца рэформы ў Рэчы Паспалітай у сярэдзіне – канцы XVIII стагоддзя, якія пачаліся пад уплывам ідэй Асветніцтва, іх падрыхтоўка і парадак рэалізацыі. Апісваюцца драматычныя падзеі прыняцця Канстытуцыі Рэчы Паспалітай. Змест рэформаў і асаблівым чынам Канстытуцыя 3 мая 1791 года даследуюцца з пазіцый пераемнасці і дыскрэтнасці прававой сістэмы. Разглядаюцца ідэалагічныя канцэпцыі сарматызму, з пазіцый якога выступала кансерватыўная шляхта, і асветніцтва, ідэі якога пашырала і рэалізоўвала партыя рэфарматараў. Выяўляецца сутыкненне і супрацьстаянне прававых інстытутаў і прынцыпаў Канстытуцыі 3 мая 1791 года, што абапіраліся на варагуючыя ідэалогіі, па пытаннях прававога статусу мяшчан, шляхты і сялянства, дзяржаўнага будаўніцтва, суадносінаў і кампетэнцыі такіх органаў дзяржаўнага кіравання, як Сойм, Кароль, Урад.*

**Уводзіны.** Вялікае значэнне для забеспячэння сацыяльнай эфектыўнасці нарматыўных прававых актаў мае іх ідэалагічная несупярэчлівасць. Яна з’яўляецца важным фактарам для свядомага і добраахвотнага выканання прававых нормаў насельніцтвам.

Гісторыя прыводзіць шматлікія прыклады нарматыўных дакументаў, якія з’яўляліся вынікам ідэалагічнай барацьбы ў грамадстве і з-за сваёй супярэчлівасці прыводзілі да далейшых сацыяльных канфліктаў. Неаднарозова падобныя прававыя акты прымаюцца ў перыяды рэформаў, кардынальных зменаў у сацыяльным жыцці народаў. Адпаведна пераемнае развіццё прававой сістэмы ў гэтыя перыяды можа перарывацца. Адным з падобных прыкладаў з’яўляюцца рэформы канца XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай і прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 года.

**Асноўная частка.** З канца XVI стагоддзя Рэч Паспалітая паступова пачынае прыходзіць у заняпад. Шматлікія войны прывялі эканоміку дзяржавы да заняпаду, які суправаджаўся палітычным крызісам. Войны і выгодная вонкавая рынкавая кан’юнктура ў выглядзе высокіх коштаў на збожжа забяспечылі дамінуючую вайсковую, палітычную і эканамічную ролю шляхты і магнатаў у краіне, замацавала прыгонніцкія адносіны. У выніку фармальна досыць шырокія паўнамоцтвы караля з-за ўсеўладдзя шляхты фактычна не рэалізоўваліся ім самастойна. «Liberum veto» ў сваю чаргу паралізавала дзейнасць Сейма. Кіраванне краінай перайшло да мясцовых органаў, якія знаходзіліся пад уплывам розных магнацкіх груповак, якія запаўнялі ўнутрыпалітычнае жыццё дзяржавы міжусобіцамі і сутыкненнямі.

Маруднае развіццё буржуазных адносін у эканоміцы, сінтэз сярэднявечных уяўленняў з элементамі пратэстанцкай ідэалогіі ў выніку прывялі да распрацоўкі і распаўсюджання сармацкай ідэалогіі, якая ў XVII стагоддзі стала пануючай у дзяржаве.

Неад’емным элементам сарматызму быў культ шляхецкага стану. Тэорыя шляхецтва будавалася як на «натуральным», так і «звышнатуральным» падмурках. У адпаведнасці з першым вызначальнае значэнне мела канцэпцыя «прыроджанай высакароднасці», згодна з якой высокая сацыяльная карыснасць шляхецтва вынікае са значнасці крыві, а паводле ідэі богаабранасці шляхты, Бог стварыў шляхту дзеля абароны веры і Каталіцкай царквы і, адпаведна, яна атрымала выключныя прывілеі.

Статус сялян і гараджанаў трактаваўся як непалітычны, ім поўнасцю адмаўлялася ў праве на ўдзел у фарміраванні органаў кіравання. Яскравай праявай культа шляхецтва і яго роўнасці стала ўвядзенне ў 1589 годзе прынцыпу аднагалосся пры прыняцці сеймавых пастаноў («liberum veto»).

Пашырэнне ўплыву шляхты прывяло да распаўсюджання поглядаў на дагаворную прыроду адносін паміж шляхтай і каралеўскай уладай. Шляхецкія свабоды трактаваліся як спрадвечныя. Экзэкуцыйная праграма патрабавала вяртання шляхце тых адвечных правоў, якія быццам бы незаконна адабрала каралеўская ўлада.

Сярод пануючага класа склалася перакананне аб дасканаласці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Яна лічылася прыкладам найлепшай формы кіравання – змешанай (паводле канцэпцыі Арыстоцеля), якая гарантуе сапраўдны росквіт свабоды. Любыя змяненні большая частка шляхты адмаўляла, лічыла шкоднымі.

Альтэрнатыўныя дамінуючай сармацкай ідэалогіі погляды ў Рэчы Паспалітай доўгі час не ўспрымаліся. Аднак пасля стабілізацыі міжнародных сувязяў у сярэдзіне XVIII стагоддзя, якія паскорылі эканамічнае адраджэнне дзяржавы, у Рэч Паспалітую з Заходняй Еўропы пачынаецца пранікненне асветніцкай ідэалогіі.

Эпоха Асветы была адлюстраваннем тых сацыяльных змен, якія ў другой палове XVIII стагоддзя прывялі да сутнаснай змены ўсіх падсістэм заходняга грамадства. «Індывідуалізм, рацыяналізм, нацыяналізм – гэта трыадзінае бажаства дэмакратыі – знайшлі юрыдычны выраз у падвышэнні ролі заканадаў-

чага органа і наступным скарачэнні законатворчай ролі судовых органаў; у вызваленні дзеянняў індывіда ад кантролю грамадства, асабліва ў эканамічнай сферы; у патрабаванні кадыфікацыі крымінальнага і грамадзянскага права; у спробе зрабіць прадказальнымі прававыя наступствы індывідуальных дзеянняў (асабліва ў эканамічнай сферы)» [1, с. 46 – 47].

У шэрагу дзяржаў дадзеныя пераўтварэнні адбыліся ў выніку рэвалюцый, напрыклад, войны за незалежнасць у ЗША (Амерыканская рэвалюцыя), Вялікай французскай рэвалюцыі ў Францыі, астатнія ажыццявілі паступовыя эвалюцыйныя змены, успрыняўшы іх ідэі. Палітычныя рэвалюцыі выклікалі кардынальную змену прававых сістэм.

Прыход у Рэч Паспалітую папулярнай філасофіі французскіх энцыклапедыстаў дапамог грамадству дзяржавы «паглядзець на свой побыт крытычна і сфармуляваць свае невыразныя імкненні да лепшага парадку рэчаў» [3, с. 86]. У рознай ступені ў творчасці гісторыкаў К. Галоўкі, Ф. Папроцкага, А. Нарушэвіча, М. Фогеля, публіцыстаў М. Белазора, С. Канарскага, К. Нарбута, юрыстаў А. Загурскага і Т. Астраўскага, фізіякратаў І. Страйноўскага і К. Богуслаўскага, рэфарматараў І. Храптовіча, А. Тызенгаўза і П. Бжастоўскага ўтрымліваецца крытыка саслоўных парадкаў «шляхецкай анархіі», бяспраўя значнай часткі насельніцтва, юрыдычнай непісьменнасці службоўцаў і суддзяў і прапановы па рэфармаванні дзяржавы на прынцыпах рацыянальнасці, адукацыі жыхароў, пераўтварэння правапарадку ў адпаведнасць з ідэямі натуральнага права, замацавання натуральных правоў і свабодаў. Абапіраючыся на іх ідэі, ажыццяўляліся рэформы Рэчы Паспалітый сярэдзіны – канца XVIII стагоддзя.

У кастрычніку 1788 года сабраўся чарговы Сейм Рэчы Паспалітай, названы пазней Чатырохгадовым. Партыя рэфарматараў у выніку вострай барацьбы змагла дасягнуць прыняцця шэрага заканадаўчых актаў, якія сталі пачаткам рэформ дзяржаўнага і грамадскага ладу Рэчы Паспалітай. Рэформы падсумавала Канстытуцыя, прынятая 3 мая 1791 года.

Аб вастрыні ідэалагічнага канфлікту ў грамадстве сведчыць і сам парадак прыняцця Канстытуцыі. Так, лідэры прагрэсіўнай плыні вырашылі прадставіць яе Сейму, скарыстаўшы пры гэтым даволі спрыяльны час – адразу пасля велікодных канікул, калі большая частка кансерватараў не паспела яшчэ з’ехацца ў Варшаву. Праект Канстытуцыі дэпутатам не раздаваўся, а быў зачытаны сакратаром, нягледзячы на пратэсты апазіцыі [6, с. 37].

Сам кароль выступаў за праект тройчы. Не вытрымаўшы такога ціску, адзін з кансерватыўных дэпутатаў узяў за руку маленькага сына, якога ён прывёў з сабой, закрычаў: «Я заб’ю сваё дзіця, каб яно не дажыло да няволі, якую рыхтуе гэты праект» [6, с. 37]. Гэты жэст не аказаў ніякага ўплыву. Канстытуцыя была прынята.

Наяўнасць моцнай кансерватыўнай партыі, неспрыяльны рэформам міжнародны ўплыў суседніх дзяржаў, непадрыхтаванасць значнай часткі грамадства да зменаў перашкаджалі правядзенню рэформаў, прывялі да непаслядоўнасці зменаў, ідэалагічнай супярэчлівасці Канстытуцыі. Так, у вобласці прававога становішча жыхароў Рэчы Паспалітай абвяшчаўся прынцып усеагульнасці грамадзянства, усе жыхары складалі «народ». Аднак адзіным артыкулам Канстытуцыі, дзе пад народам разумеліся ўсе грамадзяне, быў артыкул 11, які называўся «Народныя ўзброеныя сілы» [6, с. 111]. Усеагульнасць грамадзянства спалучалася з саслоўнай няроўнасцю грамадзян. Так, прызнаючы ролю сялянства ў складанні «найбольшых багаццяў краіны», аб’яўляючы іх вольнымі грамадзянамі, артыкул 4 Канстытуцыі 3 траўня 1791 года не надаваў ім права вольнага заключэння дамоваў з памешчыкамі і свабоды сыходу ад іх [6, с. 96 – 98]. Такое права атрымлівалі толькі «новапрыбылыя» і тыя, «якія спачатку пакінулі радзіму, а зараз вырашылі на яе вярнуцца» [3, с. 100]. Астатнім сялянам толькі гарантавалася апека дзяржавы ў забеспячэнні ўзаемнасці абавязкаў па дамовах з памешчыкамі і немагчымасць апошнімі іх парушыць.

Правы мяшчан і шляхты паступова ўраўноўваліся, але зліццё саслоўяў у палітычных правах не адбылося. У адпаведнасці з Канстытуцыяй і Законамі ад 13 мая 1791 года «Соймы» і «Соймавыя суды» Пасольская ізба, ніжняя палата, складалася з 204 дэпутатаў, абраных на шляхецкіх сойміках, і 24 прадстаўнікоў гарадоў, абраных на акруговых зборах, з правам вырашальнага голасу па пытаннях гарадоў, дарадчым па пытаннях гандлю і прамысловасці. Для ўрэгулявання правоў гарадоў і іх жыхароў 21 красавіка 1791 года быў прыняты Закон «Гарады нашыя Каралеўскія вольные ў дзяржавах Рэчы Паспалітай», які стаў неад’емнай часткай Канстытуцыі. Паводле Закона мяшчанам дазвалялася займаць ніжэйшыя пасады ў дзяржаўных установах і судах, працаваць у якасці адвакатаў і, самае галоўнае, набываць маёнткі, населеныя залежнымі сялянамі, што ў выпадку іх кошту звыш 2 тыс. злотых давала права хадайніцтва аб уводзінах у шляхецкае саслоўе. На мяшчан распаўсюджваліся такія ж правы асабістай недатыкальнасці, свабоды слова і друку, як і на шляхту [7]. У той жа час закон распаўсюджваўся толькі на каралеўскія гарады, тыя ж, што належалі іншым землеўладальнікам, атрымлівалі дадзеныя прывілеі толькі са згоды ўласніка зямлі, на якой знаходзіўся горад [7, с. 124].

У адносінах да шляхты ўводзіўся замест саслоўнага маёмасны прынцып выбарчага права – абіраць і быць абранымі па Законе «Соймікі» ад 24 лютага 1791 года мелі права толькі 18-гадовыя ўласнікі ці ўладальнікі, якія плацілі падаткі ў памеры звыш 1000 злотых.

Канстытуцыя дэкларавала непадзельнасць, суверэнітэт і незалежнасць краіны, вяршэнства закона, свабоду веравызнанняў, але пры дамінаванні каталіцкай царквы. У вобласці дзяржаўнага кіравання былі адмененыя найбольш архаічныя інстытуты дзяржаўнага права эпохі феадалізму – «ліберум вета», выбарнасць караля, права на стварэнне канфедэрацый, прынцып мясцовага прадстаўніцтва дэпутата Сейму (з гэтага часу ён прадстаўнік народа, а не свайго павета), уводзіліся інстытуты падзела ўладаў, контрасігнатуры актаў караля, стала дзейнічаючага ўрада. Аднак дадзеныя інстытуты і прынцыпы спалучаліся з саслоўным прынцыпам фарміравання вышэйшага прадстаўнічага органа (з выкарыстаннем высокага маёмаснага цэнзу), мясцовых органаў улады. Упершыню ад перыяду магнацкай алігархіі ў Рэчы Паспалітай адбылося вяртанне да традыцыі моцнага кіраўніка дзяржавы. Кароль, у адпаведнасці з новымі тэорыямі, узначаліў выканаўчую ўладу, надзяляўся шырокімі паўнамоцтвамі, аднак усе прававыя акты караля набывалі сілу закона толькі пасля подпісу адпаведнага міністра. Абвяшчаўся прынцып незалежнасці судовай улады, але захоўваліся асобныя саслоўныя суды для шляхты, гараджан і сялян.

Рэформы паспелі закрануць толькі канстытуцыйнае права, але ў адпаведнасці з прадпісаннямі Канстытуцыі 29 чэрвеня 1791 года былі створаны дзве камісіі дэпутатаў ад Польшчы і ВКЛ, якія павінны былі падрыхтаваць праект прававой рэформы, распрацаваць асновы сістэматызацыі, і ў першую чаргу кадыфікацыі крымінальнага і грамадзянскага права краіны [2, с. 104]. У аснову заканадаўства меркавалася пакласці Статут ВКЛ 1588 года [3, с. 101]. Такім чынам павінна была забяспечвацца пераемнасць паміж буржуазным і феадальным правам.

**Высновы.** Рэформы дзяржаўнага ладу і права, нягледзячы на спалучэнне ў іх нароўні з інавацыямі шматлікіх элементаў пераемнасці, не былі рэалізаваны на практыцы. Канстытуцыя 3 мая 1791 года атрымала прызнанне і ўхвалу большасці шляхты, у тым ліку на чатырох пятых соймікаў у ВКЛ [5, с. 356], аднак у выніку праіснавала толькі год і засталася хутчэй «дэкларацыяй пра намеры», а не рэальным прававым актам [4, с. 19]. Супраць рэформаў паўстала кансерватыўная арыстакратыя, якая звярнулася за ваеннай дапамогай да суседніх дзяржаў. У 1793 годзе адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай і адмена ўсіх наваўвядзенняў, а пасля падаўлення паўстання Т. Касцюшкі ў 1795 годзе Рэч Паспалітая канчаткова перастала існаваць.

ЛІТАРАТУРА


1. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования / Г.Дж. Берман; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ; Издат. группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624 с.
2. Васілевіч, Р.А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р.А. Васілевіч, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо. – Мінск: Права і эканоміка, 2001. – 363 с.
3. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 272 с.
4. Чудаков, М.Ф. Становление и развитие конституционного процесса в Беларуси (1447 – 1996 гг.): автореф. дис. … д-ра юрид. наук: 12.00.02 / М.Ф. Чудаков; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2009. – 40 с.
5. Butterwick, R. Sejm Czteroletni – szkola parlamentaryzmu / R. Butterwick // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV – XVIII стагоддзях: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск – Навагрудак, 23 – 24 лістап. 2007 г. / навук. рэд. С.Ф. Сокал, А.М. Янушкевіч. – Мінск: БІП-С Плюс, 2008. – С. 344 – 356.
6. Konstytycja 3 maja 1791 // Konstytycja 3 maja 1791. Opvacowal Jerzy Kowecki. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1991. – S. 91 – 119.
7. Miasta nasze królewskie wolne w państwach Rzeczypospolitej // Konstytycja 3 maja 1791. Opracowal Jerzy Kowecki. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1991. – S. 121 – 135.


*Паступіў 15.09.2011*

**CONTINUITY AND DISCRETENESS IN THE LAW IN THE CONTENT OF REFORM IN THE COMMONWEALTH OF POLAND IN THE MID – LATE XVIII CENTURY**

***D. SHCHERBIK***

*The article deals with the reform in the Commonwealth of Poland in the mid – late XVIII century, which began under the influence of the Enlightenment. Describes the dramatic events of the Constitution of the Commonwealth of Poland. Content of reforms and, particularly, the Constitution of May 3, 1791, studied from the standpoint of continuity and discontinuity of the legal system. We consider the ideological concepts of sarmatyzm, from a position advocated by the conservative know, and the idea of enlightenment, that implements the the party reformers. Manifest conflict and confrontation between legal institutions and principles of the Constitution of May 3, 1791, which were based on conflicting ideologies, on the legal status of the burghers, nobles and peasants, state-building, relationships and competence of such public authorities, as the Sojm, the King, the Government.*